ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 7 (324) | Субота, 3 сакавіка 1979 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## *4 сакавіка ўсе як адзін прагаласуем за кандыдатаў блоку камуністаў і беспартыйных!*

**В**ЫБАРЫ ў Вярхоўны Савет СССР — не толькі важная дзяржаўная і палітычна-масавая кампанія. Дзень, калі мы аддаём свае галасы за народных выбраннікаў у вышэйшы орган Савецкай улады, для кожнага чалавека нашай неабсяжнай Радзімы становіцца сапраўдным святам. У гэты дзень мы дэманструем сваё адзінства і згуртаванасць вакол роднай Камуністычнай партыі і ўрада, адданасць ідэям марксізму-ленінізму, непахісную гатоўнасць з поўнай аддачай сіл працаваць для хутчэйшай пабудовы камуністычнага грамадства.

Яшчэ задоўга да пачатку галасавання на выбарчых участках збіраюцца выбаршчыкі. Кожны з іх лічыць за гонар у ліку першых выканаць свой пачэсны абавязак — прагаласаваць за верных сыноў і дачок Краіны Саветаў, за непарушны блок камуністаў і беспартыйных. Асаблівае хваляванне будуць перажываць тыя, каму сёлета давядзецца галасаваць упершыню. Такіх жа толькі ў нашым універсітэце каля 600 чалавек.

Заўтра ў 6 гадзін раніцы гасцінна расчыняцца дзверы і абодвух выбарчых участкаў, якія размясціліся ў вучэбных карпусах № 1 і № 2. У ходзе падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Савет СССР ва універсітэце, як і па ўсёй краіне, зроблена ўсё, каб яны прайшлі на самым высокім узроўні. Гэта асабліва важна, бо заўтрашнія выбары будуць першымі пасля прыняцця новай Канстытуцыі СССР, якая заканадаўча замацавала за савецкім чалавекам новыя правы і абавязкі. Вялікую работу правялі на гэтым адказным этапе агітпункты, агітатары, члены выбарчых камісій, усе байцы ідэалагічнага фронту. Мы добра ведаем сваіх пасланцаў у вышэйшы орган Савецкай улады, многія з нас мелі магчымасць сустрэцца з імі.

На выбарчых участках універсітэта гамяльчане будуць галасаваць за кандыдата ў дэпутаты Савета Саюза Вярхоўнага Савета СССР па Гомельскай гарадской выбарчай акрузе № 558 другога сакратара ЦК КП Беларусі таварыша **Бровікава Уладзіміра Ігнатавіча** і за кандыдата ў дэпутаты Савета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР па Гомельскай гарадской выбарчай акрузе № 84 токара Гомельскага станкабудаўнічага завода імя С. М. Кірава таварыша **Шварова Уладзіміра Лявонавіча.** Пры вылучэнні іх кандыдатур, пры сустрэчах з імі на перадвыбарных сходах выбаршчыкі аказалі ім аднадушнае давер'е і падтрымку. Ёсць цвёрдая ўпэўненасць, што з такой жа аднадушнасцю яны аддадуць галасы за сваіх выбраннікаў заўтра ў дзень выбараў.



Як паведамлялася ў нашай газеце, перад сустрэчай з выбаршчыкамі 21-га лютага кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР па Гомельскай выбарчай акрузе № 558 другі сакратар ЦК КП Беларусі таварыш Бровікаў Уладзімір Ігнатавіч меў гутарку ў рэктарацы з кіраўніцтвам і дэканамі, цікавіўся перспектывамі развіцця універсітэта, азнаёміўся з некаторымі лабараторыямі фізічнага факультэта.

**НА ЗДЫМКУ** (злева направа): **другі сакратар ЦК КПБ У. І. БРОВІКАЎ, рэктар універсітэта Б. В. БОКУЦЬ, прарэктар па вучэбнай рабоце Л. А. ШАМЯТКОЎ і сакратар Гомельскага абкома КПБ С. П. БАБЫР у адной з лабараторый фізічнага факультэта.**

Фота **Б. Шкурко.**

## РЫХТУЕМСЯ ДА ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА

З ліку студэнтаў групы БР-11 гісторыка-філалагічнага факультэта сфарміраваны будаўнічы атрад «Таварыш». Аднакурснікі аказалі мне высокае давер'е — абралі яго камандзірам. Вопыт работы ў мяне ёсць. У мінулым годзе з'яўляўся камандзірам будаўнічага атрада «Полымя-78», які быў сфарміраваны з ліку слухачоў падрыхтоўчага аддзялення.

У гэтыя дні байцы атрада «Таварыш» рыхтуюцца да трэцяга працоўнага семестра. Кіраўнік агітбрыгады Валянціна Бандарэнка сумесна з членамі рэдкалегіі насценнай газеты занята над складаннем плана культурна-масавых мерапрыемстваў. Члены групы «Пошук» вядуць работу па падрыхтоўцы альбома «Герой - камсамолец у нашым атрадзе», прысвечаную ўдзельніку Вялікай Айчыннай вайны паэту Алесю Жаўруку. Афармляецца летапіс СБА факультэта да дзесяцігоддзя ўтварэння ГДУ. Наперадзе ў нас шмат цікавых мерапрыемстваў. Робіцца ўсё магчымае для таго, каб надзейна падрыхтавацца да працоўнага семестра.

**В. ПЯКАРСКІ,**
**камандзір будатрада «Таварыш».**

## ДЛЯ ПАДТРЫМКІ В'ЕТНАМА

Шырыцца міжнародны камуністычны і рабочы рух за салідарнасць з гераічным в'етнамскім народам. Агульную падтрымку і адабрэнне знайшоў ён на нашым факультэце. Студэнты вырашылі правесці камсамольска-маладзёжны суботнік, а заробленыя грошы пералічыць у фонд дапамогі патрыётам В'етнама, якія змагаюцца з кітайскімі агрэсарамі. На кандытарскім камбінаце «Спартак» мы выканалі аб'ём работ больш як на 200 рублёў.

**Г. ХАРОШКА,**
**студэнт 3-га курса гістфіла.**

# 8-га САКАВІКА — МІЖНАРОДНЫ ЖАНОЧЫ ДЗЕНЬ

## СЛАВА НАШЫМ ПРАЦАЎНІЦАМ!

У 1910 годзе на 2-ой Міжнароднай канферэнцыі сацыялістак у Капенгагене па прапанове нямецкай камуністкі Клары Цэткін было прынята рашэнне кожны год святкаваць 8 Сакавіка як дзень міжнароднай салідарнасці працоўных жанчын у барацьбе за раўнапраўе. Упершыню гэты дзень адзначаўся ў 1911 годзе ў Германіі, Аўстрыі, Даніі, Швейцарыі, ЗША. У Расіі ён быў праведзены толькі ў 1913 годзе пад выглядам «навуковага ранішніка па жаночаму пытанню» у Пецярбурзе.

Вялікі Кастрычнік прадаставіў жанчыне нароўні з мужчынамі сацыяльныя і палітычныя правы, стварыў умовы для росквіту яе талентаў, сапраўднага прастору для праяўлення творчай энергіі. Дзякуючы вялікай рабоце бальшавіцкай партыі свята 8 Сакавіка ў Расіі праходзіла штогод у абстаноўцы ўсё ўзрастаючай палітычнай актыўнасці жанчын. Калі ў той перыяд святкаванне Міжнароднага жаночага дня было мабілізацыяй мас на барацьбу з царызмам, капіталам за вызваленне, то цяпер — гэта дзень салідарнасці жанчын у барацьбе за мір і сацыяльны прагрэс. У краінах сацыялізму імі падводзяцца вынікі ўдзелу ў сацыялістычным і камуністычным будаўніцтве. Сёння СССР займае першае месца ў свеце па ўзроўню грамадска-працоўнай актыўнасці жанчын.

У дні суровых выпрабаванняў для нашай краіны тысячы слаўных працаўніц паказвалі прыклады мужнасці і гераізму. Са зброяй у руках яны абаранялі маладую Савецкую Рэспубліку. Сярод чырвоных камандзіраў і камісараў таксама былі жанчыны.

За баявыя подзвігі ў гады Вялікай Айчыннай вайны 91 жанчына была ўдастоена высокага звання Героя Савецкага Саюза (сярод іх 10 прадстаўніц Беларусі), больш 300 тысяч узнагароджаны ордэнамі і медалямі.

Сёння нашы жанчыны з'яўляюцца актыўнай сілай у барацьбе за ажыццяўленне дзяржаўных планаў. Яны ўносяць дастойны ўклад у стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму. У народнай гаспадарцы краіны працуе каля 55 млн. жанчын, больш 14 млн. з іх маюць вышэйшую і сярэднюю спецыяльную адукацыю, звыш паўмільёна — камандзіры вытворчасці: дырэктары заводаў і фабрык, кіраўнікі калгасаў і саўгасаў, установ. Гэтыя лічбы красамоўна сведчаць аб вялікай ролі жанчын у развіцці эканомікі.

Мы ганарымся поспехамі савецкіх жанчын у самых розных галінах дзейнасці, ганарымся тым, як выдатна яны выкарыстоўваюць умовы раўнапраўя з мужчынамі. З гонарам адзначаем, што нашы жанчыны пастаянна ўдзельнічаюць у кіраванні дзяржавай, у палітычным і грамадскім жыцці краіны. У Вярхоўным Савеце СССР яны складаюць 31 працэнт агульнай колькасці дэпутатаў, у Вярхоўных Саветах саюзных рэспублік — 35 і мясцовых Саветах народных дэпутатаў — 48 працэнтаў. У ЗША жанчыны займаюць толькі 5 працэнтаў месц у федэральных і мясцовых органах улады. У Вярхоўным Савеце СССР жанчынам належыць 475 дэпутацкіх мандатаў. Гэта больш, чым у парламентах усіх капіталістычных краін разам узятых. І сёння кандыдатамі ў дэпутаты вярхоўнага органа дзяржаўнай улады вылучаны многія і многія жанчыны — работніцы і калгасніцы, вучоныя і настаўніцы, урачы і інжынеры...

Вялікае давер'е быць у органах народаўладдзя аказана і прадстаўніцам нашага універсітэта. Студэнтка эканамічнага факультэта, ленінская стыпендыятка Людміла Краснагір з'яўляецца дэпутатам абласнога Савета, студэнтка гісторыка-філалагічнага факультэта Антаніна Бараноўская — дэпутатам гарадскога Савета народных дэпутатаў.

У нашым універсітэце пераважная колькасць студэнтаў — дзяўчаты, сярод выкладчыкаў — 179 жанчын, з іх адна доктар навук, прафесар і 49 кандыдатаў.

З вялікім задавальненнем сустрэлі савецкія жанчыны Зварот Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза да ўсіх выбаршчыкаў, грамадзян Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. «Дарагія жанчыны! Слаўныя дочкі Краіны Саветаў! — гаворыцца ў гэтым дакуменце. — Вялікі ваш уклад у дасягненні і перамогі савецкага народа. Пастаянны клопат аб жанчыне-працаўніцы, жанчыне-маці — непарушны закон нашага грамадства. Жанчынам прадастаўляюцца шырокія магчымасці для спалучэння вытворчай і грамадскай дзейнасці з выхаваннем дзяцей, клопатамі аб сям'і. Партыя і дзяржава будуць і далей паляпшаць умовы працы і быту жанчын, забяспечваць далейшае павышэнне іх ролі ў грамадска-палітычным жыцці».

Напярэдадні 8 Сакавіка — Міжнароднага жаночага дня савецкі народ ушаноўвае сваіх слаўных дачок, сясцёр, дарагіх сэрцу маці. Ушаноўвае за іх заслугі ў выхаванні падрастаючай змены, у камуністычным будаўніцтве, у стварэнні матэрыяльных і духоўных багаццяў.

## УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

### АБ УСТАНАЎЛЕННІ ШТОГОДНЯГА СВЯТА «ДНЯ САВЕЦКАЙ НАВУКІ»

Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР **пастанаўляе:**
устанавіць свята «Дзень савецкай навукі».
«Дзень савецкай навукі» святкаваць штогод у трэцюю нядзелю красавіка.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР **Л. БРЭЖНЕЎ.**

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР **М. ГЕАРГАДЗЕ.**

Масква, Крэмль, 28 лютага 1979 г.

